# «ДАЧКА — САМАЯ ЛЕПШАЯ ВЕРСІЯ НАС»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**С.:** — А я проста радаваўся, што побач ёсць Віка, мне было цікава вучыцца: бо толькі любімая прафесія і ніякіх хімій і матэматык. Атрымліваў асалоду ад такога шчаслівага перыяду жыцця. Неяк незаўважна з сяброў мы перараслі ў пару. І я рады, што стаўшы, сям'-ёй, мы засталіся сябрамі.

***— Памятаеце першы пацалунак?***

**В.:** — Так! Гэта было як у кіно! Тады мы ўсёй нашай кампаніяй апынуліся дома ў Сярожы. І вось такая кінематаграфічная карцінка: штосьці ўпала, мы кінуліся разам падымаць, паглядзелі адно на аднаго і... гэта быў не толькі пацалунак, але і зліццё лёсаў!

**С.:** — Мае бацькі жылі ў прыватным доме ў той час без усялякіх гарадскіх выгод, і я з гэтай прычыны камплексаваў, запрашаў у госці толькі хлопцаў. А тады сказаў так няўпэўнена: «Можа, да мяне пойдзем». Запрашэнне прынялі. І вось Віка заходзіць у дом, у якім горача напалена печка, і кажа: «Божа, пах дзяцінства». І ўсё, у мяне адлягло ад душы.

**В.:** — Усе вакацыі я праводзіла ў бабулі і дзядулі ў вёсцы, і цёплая печ — гэта сапраўды пах дзяцінства, шчасця, бесклапотнасці.

***— Колькі часу прайшло пасля першага пацалунку і вяселля?***

**В.:** — Фактычна пасля першага пацалунку мы ўжо не расставаліся. А вяселле згулялі, калі скончылі Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў.

**С.:** — Адразу пасля вучылішча мне прапанавалі работу ў віцебскім тэатры «Лялька» і нават абяцалі кватэру. З аднаго боку, гэта было прыемна. Але і думка пра тое, што вось у цябе такога маладога ўжо і работа, і кватэра ёсць — а далей... Разумеў, што трэба працягваць вучыцца. Вельмі добра, што побач была Віка, якая рашуча сказала: «Паехалі ў Мінск паступаць». Мы сабраліся літаральна за дзень, бацькі яшчэ перадавалі неабходныя дакументы. Нам пашанцавала, у той год набіралі курс, які спявае. Я паступіў на бюджэт, а Віка — на платнае. Пачалося цікавае студэнцкае жыццё! Нам казалі: маўляў, вы такія дружныя, толькі пакуль вучыцеся на першым курсе, але мы сябруем і цяпер.

Час вучобы прыйшоўся на першыя здымкі ў кіно. Нам вельмі пашанцавала, што першая работа — карціна Валерыя Тадароўскага «Стылягі». Мы атрымалі каласальны вопыт! Здымаліся ў Мінску, а потым нас яшчэ і ў Маскву паклікалі.

На работу ў тэатры нас запрасілі на апошніх курсах акадэміі. Але гэта не давала стапрацэнтнай гарантыі, што там мы і застанемся пасля атрымання дыплома. Размеркаванне — хвалюючы момант. Я думаў: «А калі мяне размяркуюць, напрыклад, у Гомель, ці паедзе туды Віка?»

**В.:** — Прыйшлося б ехаць. Мне здаецца, сям'ю захаваць на адлегласці наўрад ці магчыма. На шчасце для нашага асабістага жыцця і кар'еры, мы засталіся ў сваіх тэатрах пасля атрымання дыпломаў.

***— Як спраўлялі вяселле?***

**В.:** — Весела! І нават торт быў на тварах гасцей! Запрасілі 120 чалавек, даехалі толькі 100. Усё блізкія людзі!

***— Вы самі паспелі зарабіць на вяселле?***



«Стылягі» з Мінска.

**С.:** — Да таго часу ў нас былі нейкія свае зберажэнні, але, вядома, без дапамогі бацькоў не абышлося. Галоўнае, што ў нас сапраўды атрымалася свята для нас, нашых родных і сяброў.

***— Вікторыя, калі аб'яўляць вас у гала-канцэртах, вось гэта Жбанкова-Стрыганкова заўсёды неяк так шматабяцальна гучыць са сцэны, проста свята нейкае. Гэта вы так добра прадумалі з двайным прозвішчам?***

**В.:** — Дзіўна, але аб тэатральным гучанні прозвішча мне казалі ўжо некалькі чалавек. Насамрэч я хацела застацца на сваім прозвішчы, і з гэтай нагоды мелася быць сур'ёзная спрэчка з Сяргеем. А потым я пачала запаўняць дакументы і нешта там пераблытала, у выніку атрымала пасведчанне аб шлюбе з двайным прозвішчам.

**С.:** — Двайное прозвішча аказалася добрым варыянтам. Гэта і памяць пра Вікінага бацьку, і наша агульнае прозвішча.

***— Жыццё адразу пасля штампа ў пашпарце неяк адрознівалася ад ранейшага?***

**В.:** — У нашых адносінах, мабыць, не. Іншая справа, што пасля вяселля на нас пачалі ціснуць родныя: калі ўжо ў вас будзе дзіця?

***— І чаму не спяшаліся?***

**В.:** — Ёсць актрысы, якія перш жадаюць замацавацца ў тэатры, потым сысці ў дэкрэт. У мяне гэтая думка таксама была, але складалася працэнтаў 30. Вядома, думалі пра тое, што час мець дзяцей, а я ўнутрана старалася адтэрмінаваць гэтую падзею. Шчыра: я баялася, што не гатовая кагосьці выхоўваць.

Аднойчы падчас спектакля я атрымала траўму калена, нібы хтосьці намякнуў мне: спыніся, хопіць скакаць! Тады высветлілася, што я цяжарная. Гэта было ў снежні, і спачатку толькі маме сказала. А Сярожу на Новы год прыгожа запакавала скрыначку з тэстам.

**С.:** — А я адкрываю скрыначку, гляджу на палоскі і ліхаманкава думаю: колькі іх павінна быць? Лагічна разумею, што калі жонка робіць такі падарунак, то тэст станоўчы. Неўзабаве адзначалі маё 30-годдзе, тады я абвясціў родным, што мы чакаем дзіця. Адчуванне было такое, быццам забіў галоўны ў жыцці гол!

На першым УГД нам абяцалі хлопчыка. Мы ўжо імя прыдумалі: Елісей. А на другім УГД кажуць: дакладна дзяўчынка. А як жа Елісей? Успомнілі ўсе імёны і абралі для дачкі Ясенія.

**В.:** — Перад ад'ездам у радзільню прасіла Сярожу сустрэць нас з гармонікам. Потым патэлефанавала, сказала, маўляў, нічога не трэба. Але ўсё ж Сяргей арганізаваў вельмі цёплую сустрэчу — прыйшлі родныя, сябры, граў сябар сям'і на акардэоне. Гэта быў сюрпрыз. Першы час пасля родаў я жыла дома ў бацькоў. У мяне быў страх, я не ведала, што рабіць з малечай. Мама дала мне майстар-клас. І цяпер часам думаю: ці добрая я мама? Вельмі шчаслівая, што ў нас ёсць дачка. Як бы я ні любіла сваю работу і тэатр, усё адно самае галоўнае ў жыцці — сям'я, а самы важны чалавек у ёй — дзіця.

**С.:** — Вельмі добра памятаю момант, калі ў радзільні медсястра перадала мне на рукі Ясеньку. Яна крыху расплюшчыла вочка, нібы кажа мне: «Ну, прывітанне». А неўзабаве пасля нараджэння дачкі мяне зацвердзілі вядучым «Калыханкі». Наогул, нараджэнне дзіцяці змяняе ўсё ў жыцці, ты нават пачынаеш больш разумець. Самая першая любоў — мама, жонка — яшчэ адзін смак любові, і нешта зусім неверагоднае, новая ступень — любоў да дачкі.

***— Вам хто-небудзь дапамагае з Ясеніяй або яна расце за кулісамі?***

**В.:** — Яна з намі на ўсіх работах. У яе ўжо ў тэатры ёсць роля, на канцэртах спявае з намі. У мяне свой праект — разам з калегамі праводзім вясельны абрад. Дык вось Ясенька ўжо таксама ўдзельнічала — перадавала абярэгі. Яна ходзіць у садок, а па вечарах — у тэатры. Мы глядзім, у каго лягчэйшы спектакль, той і едзе на работу з дачкой. Аднойчы я агучвала дзіцячыя казкі, закалыхваючы Ясеньку на руках.

Дачушцы ўжо пяць гадоў. З ёй няма ніякіх праблем, яна можа сама сябе заняць гульнёй. Неяк з ёй засталася мая стрыечная сястра. Потым кажа: «Яна ў вас такая дарослая»... Проста яна ў свае пяць гадоў бачыла больш, чым мы ў тым жа ўзросце, і выдатна, што кожнае новае пакаленне лепшае і разумнейшае.

**С.:** — Яна розная! Часам такі маленькі мудрэц... Быў футбольны матч, я гуляў за акцёрскую каманду «БеZгрыму». Мой тата нядаўна пайшоў з жыцця, і Ясенька кажа: «Дзядуля «хварэе» за цябе з нябесных трыбун». А калега па камандзе, пагутарыўшы з Ясенькай, сказаў: «Яна разумнейшая за мяне». Мы разам чытаем казкі, гуляем...

Нядаўна Віка з'язджала на 17 дзён на гастролі, і я думаў, што складана будзе аднаму з дачкой, памятаючы мінулы вопыт, калі яна была зусім маленькай. Цяпер думаю, што без Ясенькі было б значна цяжэй. У мяне тады быў вельмі насычаны графік: рэпетыцыі — тэатр — здымкі, прэзэнтацыя каманды «БеZгрыму». І дачка ўвесь час са мной. Яна не толькі вытрымала гэтую нагрузку, але і мяне падбадзёрвала.

**В.:** — Сярожа — унікальны бацька! Ясенька так і кажа: «Татачка, я цябе люблю, а маму проста абажаю».

***— Напэўна, дачка пойдзе па вашых прафесійных слядах...***

**С.:** — Гэта яна сама потым вырашыць. Пакуль мы бачым, што дачка расце вельмі добрым, чулым чалавекам, і гэта — самае важнае. У характары Ясенькі ёсць і мае, і Віцыны рысы, так што дачка — самая лепшая версія нас.

***— Сучасныя дзеці нараджаюцца з гаджэтамі ў руках. А ваша?***

**С.:** — Калі ў яе ёсць выбар: жывыя зносіны ці смартфон, Ясенька абярэ першае, чаму мы вельмі рады. Пры гэтым яна запісала відэаблог пра тое, як трэба даглядаць джунгарскага хамяка — гэта таксама член нашай сям'і. Зараз Ясенька ў сваякоў у вёсцы, там ёй вельмі падабаецца, і мы гэтаму рады.

***— Яна не просіць брацікa ці сястрычку?***

**В.:** — Часам разважае на гэтую тэму.

**С.:** — Мяне неяк запрасілі запісаць калыханкі, скажам так, мужчынскі іх варыянт. І ў нейкі момант я востра адчуў, што хачу сына! Віка і Ясенька не пярэчаць!

**В.:** — А калі атрымаецца дачка?

**С.:** — Пойдзем на трэці заход!

**В.:** — Ідэальная сям'я ў маім уяўленні: тата, мама, сын і дачка. І ў мяне, і ў Сярожы ёсць браты, таму мы ведаем, як гэта выдатна, калі ты не адзінае дзіця ў сям'і.



Папа ў тэлевізары.

***— Вы ходзіце на спектаклі адно да аднаго?***

**В.:** — Раней атрымлівалася часцей. Лічу, што акцёру трэба абавязкова хадзіць у іншыя тэатры, гэта свайго роду майстар-клас.

**С.:** — Хацелася, каб былі стажыроўкі, каб бачыць, як працуюць іншыя, якія тэндэнцыі ў развіцці тэатральнага мастацтва ў свеце. Таму хоць бы дома стараемся хадзіць у тэатры. І многія калегі нас захапляюць!

***— Засталіся пытанні з серыі «проза жыцця». Як вы размяркоўваеце хатнія абавязкі?***

**В.:** — Ніяк. Хто можа, той і робіць. Сяргей з тых мужчын, якіх не трэба прасіць памыць посуд, напрыклад.

**С.:** — У мяне ёсць добры сябар, дарэчы, шматдзетны бацька, ён распавядаў, як прывучаў сваіх дзяцей да парадку. Тлумачыў ім: паеў — памый талерку, гэта займае менш чым хвіліну часу. Усё, што займае менш чым хвіліну, зрабі зараз! І я таксама ўзяў гэтае правіла на ўзбраенне.

**В.:** — Сапраўды, прасцей адзін раз зрабіць генеральную ўборку, а потым падтрымліваць парадак. На шчасце, мы навучыліся жыць так, каб побыт нас не напружваў.

***— Хто адказвае за сямейную бухгалтэрыю?***

**С.:** — Віка. Яна больш рацыянальны чалавек, у мяне, як толькі здараюцца грошы ў руках, так адразу хочацца іх выдаткаваць на патрэбныя рэчы ў дом або для прафесіі. Шкада, што мы не змаглі зарабіць на кватэру, хоць працуем без выхадных. Цяпер якраз вырашылі набыць жыллё. Першы ўнёсак складаецца з нашых зберажэнняў і дапамогі Віцыных бацькоў. Потым прыйдзецца дадаваць крэдытныя сродкі. Усё як у большасці людзей...

***— А як жа гісторыі аб казачных заробках у кіно?***

**С.:** — Не ведаю, хто іх прыдумаў. Нават у расійскім кіно па-сапраўднаму высокія стаўкі ў некалькіх топавых артыстаў.

**В.:** — Як ні дзіўна, але ў нас найлепшы перыяд заробкаў супаў са студэнцкімі гадамі. У «Стылягах» плацілі 100 долараў за здымачны дзень. А мы толькі ў Маскве працавалі восем дзён. Мы з Сяргеем удваіх спявалі ў рэстаране і за вечар маглі зарабіць больш, чым зарплата ў тэатры, але мне там было не вельмі камфортна.

**С.:** — Ганарар у «Стылягах» — гэта халадзільнік, мікрахвалеўка сабе і бацькам у падарунак, прас, ноўтбук, які мы купілі для работы, і ён да гэтага часу жывы.

***— Вікторыя, як размяркоўваеце грошы?***

**В.:** — У нас пасля вяселля была мэта — свая кватэра, вось на яе і складаем грошы ў скарбонку, колькі атрымліваецца. Звычайна гэта ганарары за фільмы, канцэрты. Абмяркоўваем, што нам трэба купіць для сям'і. А так у кожнага ёсць зарплата, якой ён вольны распараджацца па сваім меркаванні. Ведаеце, я не стану папракаць Сярожу, што ён выдаткаваў грошы на футбольную каманду, таму што ў душы ён футбаліст! У мяне таксама ёсць свае жаночыя радасці, і я ведаю, што муж не скажа: магла б купіць туфлі працейшыя, крэм таннейшы, але і я гляджу не на лічбы ці брэнд, а на якасць.

**С.:** — Фінансавы дабрабыт вельмі важны для кожнага чалавека, тым больш для сям'і з дзіцем. Можа, калі б мы збіралі-збіралі, ва ўсім сабе адмаўлялі, то, умоўна кажучы, назапасілі б на кватэру значна больш, але што гэта было б за жыццё?

***— Як вы праводзіце адпачынак?***

**В.:** — У нас рэдка супадаюць выхадныя, а вы кажаце адпачынак...

**С.:** — Напэўна, самы сумленны адказ будзе: ніяк. Часцей за ўсё адпачынак прысвячаецца дадатковай рабоце. Мы толькі пару разоў выязджалі ў адпачынак. Першы раз — з Ясеніяй, калі ёй было два гадкі. Былі асцярогі, а потым убачылі, што ў самалёце ёсць сем'і нават з немаўляткамі, у Балгарыі створана цудоўная інфраструктура для бацькоў з маленькімі дзецьмі. Цікавасць больш даведацца пра Беларусь, пабачыць свет у нас ёсць. І мы гэта ажыццявім!

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

**Фота з сямейнага архіва герояў публікацыі.**